# Сенатары дапамогуць Нацыянальнай бібліятэцы

Дапамагчы кіраўніцтву Нацыянальнай бібліятэкі вырашыць найбольш вострыя праблемы яе жыццядзейнасці — такая была мэта наведвання галоўнай бібліятэкі краіны членамі Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на чале са старшынёй верхняй палаты парламента Аляксандрам Вайтовічам. Яны азнаёміліся з кніжнымі фондамі, станам матэрыяльна-тэхнічнай базы, работай аддзелаў і чытальных залаў. Затым адбылася сур'ёзная і грунтоўная размова з калектывам і кіраўніцтвам бібліятэкі.

Універсальны па тэматыцы фонд бібліятэкі налічвае каля 7,3 мільёна адзінак захоўвання больш як на 50 мовах свету. Бібліятэка валодае самымі унікальнымі калекцыямі дарэвалюцыйных замежных перыядычных выданняў і рукапісных матэрыялаў. Супрацоўнікамі бібліятэкі ажыццяўляецца вялікая работа па выяўленню беларускіх старадрукаваных выданняў, якія знаходзяцца за межамі краіны. Рэдкія кнігі, якія захоўваюцца ў бібліятэцы, патрабуюць асаблівых умоў захоўвання. А каб чытачы маглі з імі пазнаёміцца, тэксты трэба перакладаць у машыначытальную форму. І на ўсё гэта неабходны немалыя сродкі.

Свае прапановы кіраўніцтва бібліятэкі папрасіла ўнесці ў праект закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь». Аднак іх аказалася так многа, што сенатары выказаліся на карысць таго, каб Нацыянальнай бібліятэцы быў прысвечаны асобны закон. На думку Аляксандра Вайтовіча, Нацыянальная бібліятэка як асноўная крыніца інфармацыі для многіх людзей, выконваючы яшчэ і ролю вядучага культурна-асветнага цэнтра, з'яўляецца выключна важнай установай, развіццю і ўмацаванню якой неабходна ўдзяляць належную ўвагу.

**Прэс-служба Савета Рэспублікі.**